**Мармыш Аляксандр Валянцінавіч**

# ГРОДНА У СКЛАДЗЕ ТРЭЦЯГА РЭЙХА

*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*Кафедра ваеннай і экстрэмальнай медыцыны*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык кафедры ваеннай і экстрэмальнай медыцыны, падпалкоўнік м/с Ляскевіч К.Л.*

Пасля адыходу Чырвонай арміі у горадзе ўсталявалася акупацыйная нямецкая ўлада. Гэта адбылося 23 чэрвеня, калі баі за горад яшчэ грымелі ў яго ваколіцах.Акупацыя мела спланаваны характар.Прынцыпы і метады гэтага "парадку" акупантаў былі часткай ідэалогіі фашызму, гітлераўскіх планаў "Ост", "Барбароса" і іншых дакументаў нацысцкай Германіі. Гэта былі бязлітаснаць і гвалт, *антысемітызм*, *расізм* і *антыкамунізм*. Акупацыйны рэжым з самага пачатку прадугледжваў безагаворачнае падпарадкаванне, рабаўніцтва, прымусовую працу, планамернае суцэльнае знішчэнне пэўнай часткі насельніцтва – камуністаў і савецкіх работнікаў, яўрэяў і цыган, проста хворых людзей. Таксама знішчэнню падлялагі ўсе, хто выказваў незадавальненне або ствараў небяспеку для войскаў Германіі. У Гродне планавалася пасяліць 10 тысяч нямецкіх каланістаў, а ў якасці рабочай сілы пакінуць 20 тысяч мясцовых жыхароў.

Акупацыйная жыццё змяніла як увесь парадак жыцця гараджан , так і аблічча самога Гродна. Горад увайшоў у адпаведную адміністратыўную акругу "Беласток". "Горад Гародня зараз атрымлівае назву Гартэн", – згадвалася ў загадзе гродзенскага павятовага камісара фон Плетца. Памянялі свае назвы і вуліцы горада.

Цяперы яго жыхары крочылі па "Кёнігсбергерштрасэ", а не па "Пілсудскага", па "АдольфГітлерштрасэ" замест "Ажэшка". А на будынку школы імя С. Баторыя па вул.Пілсудскага (цяпер педколеджа на вул. Леніна) нямецкі надпіс сведчыў, што тут размясціўся зборны пункт для адпраўкі на работу ў Германію.

Калі перанесціся ў акупаваны Гродна, то адкрылася б наступная карціна. Працуюць фабрыкі: мэблевая, тытунёвая, абутковая, гарбарная, піваварны завод – усяго 11 буйных прадпрыемстваў. Дзеці ходзяць у школы. З новых устаноў працавалі беларуская школа (200 вучняў), школа для *фольксдойчаў*, польская гімназія (60 вучняў), ліцэй. Дзейнічаюць камерцыйныя фірмы, у тым ліку нямецкія "Рупель", "Цымерман і Маркс", "Варэнсгросгандлюнг". Людзі ходзяць на рынкі і ў крамы. Вядзецца служба ў каталіцкіх, праваслаўных і лютэранскім прыходах.

І побач з гэтамі рысамі штодзённага жыцця было іншае. 1 кастрычніка ўладамі было абвешчана пра стварэнне для яўрэяў двух гета. Гета № 1 знаходзілася ў квадраце сучасных вуліц Замкавая – Траецкая – Віленская – Савецкая. Гета № 2 – у квадраце сучасных праспекта Касманаўтаў – вуліц Лідская – Белуша – Антонава. За час акупацыі ў абодвух гета было знішчана на месцы або вывезена ў канцлагеры 20577 яўрэяў. Гэта была гродзенская старонка *Халакосту*.



Репозиторий ГрГМУ

*Сведка падзей*

Згадвае Лейза Рэйзер, жыхар Гродна: "Гета №1 зачынілі 1 лістапада 1942 г. Аб'явілі, што вывозяць у шахты. Загадалі ўзяць працоўную вопратку і інш. 10 лістапада Візо і Сцяблоў (*кіраўніцтва гета*) расстралялі натоўп, які збіраўся ўзяць хлеб у жыхароў. 15 лістапада Візо, Сцяблоў і Рэме ў 10 гадзін вечара ўвайшлі ў гета, выгналі ўсіх у бялізне яўрэяў і трымалі 8 гадзін. Кіямі гналі да эшалона і прымушалі спяваць розныя яўрэйскія песні. Адправілі ў пасажырскім вагоне па 30 чалавек у купэ. Піць не давалі. За жменю снегу патрабавалі 20 марак. Памерлых грузілі разам з жывымі.У Калбасіна (лагер ля Гродна) трымалі без вады і ежы, а калі знаходзілі кал, то прымушалі есці. Туда завезлі 25 тысяч з правінцыі. Штодзень гестапаўцы пад пагрозай смерці патрабавалі золата."

Рэпрэсіі тычыліся ўсіх катэгорый гараджан. Падстаў для гэтага было ў акупантаў дастаткова: парушэнне каменданцкай гадзіны, дапамога яўрэям, гандаль прадуктамі харчавання без афіцыйнага дазволу.

Акрамя гета ў горадзе было некалькі лагераў для ваеннапалонных: у раёне Фолюша, Ласосна, Калбасіна, Кульбакаў, у Румлёва, па вуліцы Чырвонаармейскай і на месцы сучаснага шматпавярховага дома на вакзальнай плошчы (магазін "Біруза").

Гвалты, расстрэлы заложнікаў, тэрор і забойствы грамадзянскага насельніцтва сталі звычайнай з'явай у акупаваным горадзе.

Акупацыя доўжылася больш за тры гады. Як ставілася насельніцтва да новай рэчаіснасці? Па-рознаму. Як палічылі акупацыйныя ўлады, у Гродне на 29 лістапада пражывала 21500 палякаў, 18 560 яўрэяў, 5200 беларусаў, 2060 рускіх, 122 фольксдойча, 48 літоўцаў. Да розных катэгорый насельніцтва гітлераўцы ставіліся па-рознаму. У гэтым была палітыка, і жыхары гэта адчувалі. У кожнай групы і катэгорыі гараджан быў свой даваенны досвед.

*Сведка падзей*

Згадывае С.У. Рой, 1922 г.н.:" Калі немцы прыйшлі, адзін з маміных знаёмых сказаў: "*Ну вось і добра, выгналі бальшавікоў. Вызвалілі нас*". А іншы ў адказ: "*Пачакайце, пачакайце. Невядома, што яшчэ будзе.*" А мама помніла немцаў, бо пад час першай сусветнай працавала ў бальніцы для палонных на кухні. Страшна было, калі яўрэяў забівалі. Помню, як гналі па горадзе калону яўрэяў. Мы з мамай якраз ішлі і ўбачылі знаёмых яўрэк. Тыя пачалі махаць рукамі і крычаць: "*Фэля, Фэля! Мы больш не ўбачымся!*" А немец: "*Los! Los!*". Яўрэяў вывозілі з горада і тут жа расстрэльвалі."

Акупацыйная палітыка адразу выклікала супраціў. Але, як паказалі падзеі на савецка-германскім фронце, яно магло быць толькі ў глыбокім тыле праціўніка. Ні ў 1941 г., ні на наступны год ніякай сувязі з савецкім ваенным камандаваннем не існавала. Са жніўня 1941 г. па студзень 1942 г. здолела пратрымацца падпольная група ваеннага інжынера Мікалая Волкава. Увесь час акупацыі, да ліпеня 1944 г., змагаліся патрыёты на чале з рабочым мясакамбіната Васілём Разанавым. На чале іншых падпольшчыкаў

Рэпазіторый ГрГМУ

былі механік лесазавода С. Лямаў, машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо М.Багатыроў, слесар-рамонтнік Г. Святлічны, афіцэр С. Панасюк. Яны аб’ядноўвалі звыш 60 чалавек. Групы мелі цесныя кантакты паміж сабою, а з цягам часу – і з партызанамі. Плёнам іх барацьбы стала выратаванне гродзенцаў з нямецкага палону і катаржных работ, інфармаванне гараджан, шматлікія дыверсіі.

*Постаць у гісторыі*

Непрыкметным подзьвігам стаў учынак былога каталіцкага святара Максіміліяна Кальбэ. У 1922-1927 гг. ён служыў у Францысканскім касцёле. Рэдагаваў часопіс “RycerzNiepokolanej”. 17 лютага 1941 г. гестапа арыштавала а. Кальбэ і іншых францысканцаў. З часам ўсё вязні трапілі ў Асвенцым. Там а. Кальба ўселяк падтрымліваў людзей. Аднойчы за уцёкі вязьня эсэсаўцы ў пакаранне вырашылі забіць дзесяць чалавек. Сярод іх быў Францышек Гаёўнічак, які згадаў, што ніколі не ўбачыць сваіх жонку і дзяцей. На тое, а. Кальбэ прапанаваў сваю кандыдатуру замест гэтага бацькі сямейства ў лік тых дзесяці ахвяраў. Гітлераўцы згадзіліся на замену. За сваю пакутніцкую гібель М.Кальбэ быў пазней кананізаваны.

Побач з гэтым камуністычна-камсамольскім падполлем фашыстам супрацiўляліся і ў гета №1. Сярод разнастайных форм барацьбы падпольшчыкаў гета была арганізацыя ўцёкаў. Так, у ноч на 7 лютага 1943 г. група моладзі, каля 30 чалавек, вырвалася з-за загароджы і аб’ядналася з партызанамі ў Начскай пушчы. Але так пашчасціла далёка не ўсім уцекачам.

У заключэнні хацелася б сказаць, што гады акупацыі ў Гродне былі цяжкімі. За гады вайны горад быў разбураны на 43%. Ён страціў 33 тысячы сваіх грамадзян. І ўвесь гэты час жыхары Гродна змагаліся з фашызмам у розных арміях і на розных участках барацьбы. Памяць у назвах вуліц, у помніках, мемарыяльных шыльдах і дагледжаных братэрскіх магілах.

**Марущак Денис Александрович**

## БОБРУЙСКАЯ ОПЕРАЦИЯ

*УО «Гомельский государственный медицинский университет»*
*Кафедра военной и экстремальной медицины*
*Научный руководитель – старший преподаватель кафедры военной и экстремальной медицины, подполковник медицинской службы Семутенко К.М.*

Бобруйская наступательная операция являлась составной частью стратегической операции «Багратион». Замысел советского командования заключался в нанесении по немецким войскам ударов по сходящимся направлениям из районов севернее Рогачева и южнее Паричи в общем направлении на Бобруйск с целью окружения и уничтожения основных сил 9-й немецкой армии и дальнейшего наступления на Пуховичи и Слуцк.

Войска 1-го Белорусского фронта перешли в наступление с рассветом 24 июня. В первые дни наступления благоприятно развивались события на



Репозиторий ГрГМУ